## ■ Веды ў цане

# РАСПЛАТА ЗА НЕПАСПЯХОВАСЦЬ

**2,5 тысячы подпісаў, сабраныя студэнтамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта супраць увядзення платы за пераздачу залікаў і экзаменаў, не дапамаглі — загадам рэктара БДУ ад 12 лістапада было зацверджана Палажэнне аб арганізацыі атэстацыі асобаў, якія не здалі экзаменаў, залікаў, не прайшлі іншых формаў кантролю за вучэбнай дзейнасцю, прадугледжаныя вучэбнымі планамі.**

«Плата за паўторную здачу залікаў і іспытаў ужо даўно ўведзена ў большасці беларускіх ВНУ, — патлумачылі гэты крок у прэс-службе ўніверсітэта. — БДУ да апошняга часу заставаўся адным з нямногіх універсітэтаў, дзе гэтая практыка не прымянялася. З мэтай павышэння вучэбнай дысцыпліны і адказнасці студэнтаў такі парадак уведзены і ў БДУ. Цяпер студэнтам, якія дапусцілі акадэмічную запазычанасць, у тым ліку ў выпадках няяўкі без уважлівых прычын на экзамен або залік, трэба будзе аплаціць іх паўторную здачу.

У БДУ ўпэўнены, што ўнясенне платы за паўторную здачу іспытаў і залікаў стане дадатковым стымулам для тых, хто не надае належнай увагі вучобе ў ВНУ. Новаўвядзенне не закране абсалютную большасць студэнтаў, якія сумленна ставяцца да вучобы.

Пры распрацоўцы палажэння адміністрацыя ўніверсітэта ўлічыла пазіцыю ўсіх вучэбных падраздзяленняў. Палажэнне ўступае ў сілу з 1 студзеня, гэта значыць, закране зімовую сесію. Але пакуль што ніякіх канкрэтных лічбаў — колькі будзе каштаваць паўторны візіт студэнта да выкладчыка з мэтай здачы экзамену або заліку — ва ўніверсітэце назваць не могуць. Яны яшчэ распрацоўваюцца. Трэба дадаць, што ў іншых ВНУ гэтыя лічбы выглядаюць даволі сімвалічна, а ў некаторых нават не перавышаюць кошту абеду ў студэнцкай сталовай.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

Утерянное свидетельство о государственной регистрации частного торгового унитарного предприятия «Автомобиле» (УНП 191001292) **считать недействительным.**
УНП 191704884

Страховые полисы добровольного страхования транспортных средств граждан форма 2РН №№0014423, 0014428-0014432 с логотипом ЗСАО «БелИнгострах», квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) форма 1-СУ серии КС №4248524-4248525 **считать недействительными.**
УНП 100219645

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5** | | |
| **Продавец** | **Унитарное предприятие «Гомельвторчермет», г. Гомель, ул. Советская, 123а** | | |
| **Предмет аукциона (имущество продается одним лотом)** | | | |
| **Инвентарный номер** | **Наименование** | **Общая площадь** | **Назначение** |
| 350/С-73912 | **Здание проходной** | 6,9 кв.м | Здание неустановленного назначения |
| 350/С-73911 | **Здание гаражей** | 57,21 кв.м | Здание специализированное автомобильного транспорта |
| | **Здание склада** | 28,57 кв.м | |
| 350/С-73910 | **Административное задание** (в том числе семь пристроек) | 203 кв.м | Здание административно-хозяйственное |
| **Составные части:** уборная (3,5 кв.м), ворота металлические с калиткой, тротуары из плитки (33,99 кв.м), забор кирпичный (8,84 м.п.), беседка (4,64 кв.м), навес (2,52 кв.м), забор дощатый (75,19 м.п.), асфальтобетонное покрытие (268,4 кв.м), тротуар асфальтобетонный (22,36 кв.м) | | | |
| В состав предмета аукциона входит **оборудование:** аппарат АОГВ 11.6 квт (газовый котел), счетчик газовый МР-8, защитные роллеты в количестве 16 шт. | | | |
| **Месторасположение предмета аукциона:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Новополесская, 20 | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 1 636 191 640 белорусских рублей** | | | |
| **Сведения о земельном участке**: земельный участок предоставлен продавцу для размещения объектов административного назначения на праве постоянного пользования площадью **0.1037** га. **Ограничения**: согласно генеральному плану г. Гомеля территория находится в зоне резерва многоквартирной жилой застройки. | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи. | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **18.12.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **17.12.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д.5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** | | |


# ЭХ, ДАЖЫНАЧКІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.
**Узнагароду за шматгадовую добрасумленную працу з рук старшыні Мінскага аблвыканкама Сямёна ШАПІРЫ атрымлівае член Саюза пісьменнікаў Беларусі, педагог са Смілавіч Іван ЯРАШЭВІЧ.**

Сорак гадоў спяшаецца на сваё рабочае месца галоўны заатэхнік аграфірмы «Лебедзева» Маладзечанскага раёна Тамара Аляксейка. Яна ўзнагароджана медалём «За працоўныя заслугі». Не шмат такіх спецыялістаў, як галоўны ветэрынарны ўрач філіяла «Пяцігор'е» агракамбіната «Дзяржынскі» Дзмітрый Палевікоў, у якога захаванасць пагалоўя буйной рагатай жывёлы 99,6%. Ён у ліку ўзнагароджаных ганаровымі граматамі Мінаблвыканкама.

У абласным свяце-кірмашы прыняў удзел і гетман (губернатар) краю Высачына Іржы Бегаунак. Высачына — буйны цэнтральны рэгіён Чэхіі з развітой сельскай гаспадаркай, асноўны напрамак — селекцыя і вытворчасць бульбы.

— У чэхаў таксама ёсць свята накшталт вашых «Дажынак» — штогадовая выстава «Зямля-карміцелька», на якой прадстаўляюць сваю прадукцыю і беларускія сельгаспрадпрыемствы, — канстатаваў госць.

Іржы Бегаунак прывёз на Міншчыну вялікую дэлегацыю ўрачоў па абмене вопытам. Але, акрамя аховы здароўя, яго цікавяць такія кірункі, як спорт, бізнес, сельская гаспадарка.

## ДАДОМУ — НА НОВЕНЬКІХ CHEVROLET NIVA

**У Ельск з'ехаліся найлепшыя аграрыі з усёй Гомельшчыны. Тых, каго мы, журналісты, прывыклі бачыць на полі ў рабочым адзенні, на абласным свяце было не пазнаць. Паважныя мужчыны ў шэрых касцюмах з гальштукамі, якія шчыравалі ад світання да світання ўсё лета, прымалі заслужаныя ўзнагароды.**


Фота gp.by
**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК агледзеў выставу сельгастэхнікі.**

Сёлета найлепшымі ў вобласці прызнаны Гомельскі, Веткаўскі і Добрушскі раёны. Пераможцы пакідалі фестываль на новенькіх кампактных Chevrolet Niva. Раёнам, якія сталі лідарамі, вядома, пашанцавала з надвор'ем. У чэрвені-ліпені на ўсходзе вобласці ўсё ж былі ападкі, у адрозненне ад раёнаў у цэнтральнай і паўднёвай частцы, дзе не выпала, бадай, ні кроплі дажджу. Засуха, якая абрынулася на большую частку поўдня краіны, пазбавіла вяскоўцаў практычна паловы запланаванага ўраджаю. І ўсё ж у 2015 годзе было сабрана больш за 1,1 млн тон збожжа каласавых культур і кукурузы.

Тэмп росту выручкі ад рэалізацыі сельгаспрадукцыі ў Гомельскай вобласці ў студзені—верасні склаў 115%, што з'яўляецца адным з найлепшых паказчыкаў у рэспубліцы. Старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік, які павіншаваў аграрыяў, адзначыў, што вясковыя працаўнікі ў лідарах і па паказчыку рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі на аднаго працуючага:

— Сёлета ён склаў Br9,5 млн пры сярэднім па рэспубліцы — меней за Br6 млн. Такія вынікі пацвярджаюць, што аграрны комплекс нашага рэгіёна мае дастатковы запас трываласці і здольны вырашаць задачы любой складанасці.

Уладзімір Андрэевіч адзначыў, што менавіта праца людзей ляжыць у аснове харчовай бяспекі краіны:

— Гэта і ёсць падмурак рэальнай незалежнасці дзяржавы, стабільнасці грамадства і самы важны фактар самапавагі і гонару беларускага народа.

Для гасцей свята было зроблена ўсё, каб адпачыць душой і целам. Хочаш — глядзі трансляцыю ўзнагароджання на вялікім экране побач з Домам культуры. Хочаш — ласуйся прысмакамі харчовых прадпрыемстваў. Хочаш — танцуй пад спевы самадзейных калектываў. Выставы народных умельцаў прапанавалі самыя разнастайныя вырабы ручной работы. А для тых, у каго ёсць фізічная сіла, была арганізавана пляцоўка з бамперболамі.

Што вельмі прыемна для ўсіх жыхароў маленькага райцэнтра, горад сапраўды змяніў аблічча. Здаецца, вуліцы сталі прасторнейшымі, у тым ліку за кошт аднаўлення дарожнага пакрыцця, добраўпарадкавання тэрыторый, усталёўкі блакітна-белых агароджаў. Важна, як гавораць людзі, што змянілася не толькі афарбоўка-тынкоўка. Змяніліся адносіны людзей да свайго мястэчка. Сталі неяк ветлівейшыя, душэўнейшыя.

## «ПАДКОВА» ТАМ, ДЗЕ ТРЭБА

**— Здараецца, павесім падкову на сцяну і чакаем, што прыйдуць дабрабыт і багацце. А ў сельскай гаспадарцы яе трэба, так бы мовіць, прыбіць на капыты каня і араць, араць і араць. Па-мойму, гэтая «падкова» ў аграрнікаў Гродзеншчыны там, дзе трэба, — зазначыў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіл РУСЫ на абласным фестывалі-кірмашы «Дажынкі-2015» у Дзятлаве.**


Фота БЕЛТА.
**Ураджайны каравай — у руках старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра КРАЎЦОВА.**

Выказаўшы ад імя кіраўніцтва краіны глыбокую ўдзячнасць працаўнікам вёскі, аграпрамысловага комплексу Гродзеншчыны за іх работу, Міхаіл Русы ўручыў Грамату Савета Міністраў Герою Беларусі, старшыні СВК «Прагрэс-Верцялішкі» Гродзенскага раёна Васілю РАВЯКУ: у гэтай гаспадарцы сёлета атрымалі з гектара 104,1 цэнтнера збожжавых і зернебабовых культур.

Увогуле ж, раслінаводчая галіна вобласці спрацавала нават лепш за паспяховы мінулы год. Намалочана 1 мільён 707 тысяч тон збожжа (без кукурузы) пры сярэдняй ураджайнасці 51,4 цэнтнера з гектара. У тых гаспадарках, дзе ў аптымальныя тэрміны пасеялі, своечасова правялі падкормліванне раслін, іх абарону ад шкоднікаў, пустазелля, і ўраджай атрымалі добры. Гэтым даказаўшы, што дзякуючы прафесіяналізму кіраўнікоў і спецыялістаў, прымяненню перадавых тэхналогій нават ва ўмовах засухі можна дабівацца высокага выніку.

Арганізатары свята падрыхтавалі для мясцовых жыхароў і гасцей шмат цікавага. Прычым, згодна са старажытнай вясковай традыцыяй, рабілася гэта талакой. Зразумела, галоўная «скрыпка» ў падрыхтоўчых работах належала дзятлаўчанам, але да гаспадароў далучыліся і іншыя рэгіёны. Напрыклад, летам райцэнтр упрыгожылі разнастайнымі кампазіцыямі майстры зялёнага будаўніцтва з прадпрыемстваў жыллёва-камунальнай гаспадаркі. А яшчэ адным падарункам гораду сталі самыя розныя па канструкцыі лаўкі, якія спецыяльна вырабілі для тутэйшага парку ў кожным з раёнаў Гродзеншчыны. Акрамя таго, былі наладжаны фестывальныя падворкі, дзе спявалі, танцавалі і, натуральна, шчодра частавалі стравамі сваёй кухні.

— Добра вядома, што лёгкага хлеба не бывае. Вось і сёлета сялян выпрабоўвалі на трываласць і дэфіцыт фінансавых сродкаў, і дыспарытэт цэн, і ўмовы надвор'я. Нягледзячы на гэта, працаўнікі вёскі выканалі ўвесь планавы аб'ём работ і атрымалі дастойныя вынікі, — сказаў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ, адкрываючы цырымонію ўзнагароджання найлепшых працаўнікоў аграпрамысловага комплексу.

Сёлета адзін з самых важных кірункаў для аграрнікаў вобласці — аднаўленне пагалоўя свіней, якое панесла сур'ёзныя страты з прычыны АЧС. Нядаўна ўведзены ў строй буйныя свінакомплексы ў Ваўкавыскім і Карэліцкім раёнах, у апошнім будуецца яшчэ адзін.

Дарэчы, Гродзеншчына сёлета не толькі пашырыла геаграфію паставак мяса-малочных вырабаў у рэгіёны Расійскай Федэрацыі, але і распачала асваенне новых рынкаў — у Кыргызстане, Вялікабрытаніі. Гродзенскі і Слонімскі мясакамбінаты атрымалі сертыфікат «Халяль», які дазваляе пастаўляць прадукцыю ў мусульманскія краіны.

— Галоўную задачу па забеспячэнні краіны прадуктамі харчавання аграпрамысловы комплекс выканаў, — лічыць Уладзімір Краўцоў. — Зараз наша найважнейшая задача — забяспечыць фінансавую ўстойлівасць гаспадарак, паскорыць іх выхад на самафінансаванне. І ў першую чаргу зрабіць усё, каб не было стратных арганізацый. Гэта істотна палепшыць эканоміку ўсёй аграрнай галіны, дапаможа падняць узровень даходаў сялян.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*
**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*
**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*